Л.А.Дзямешка, *прафесар*
К.У.Міхайлава, *суіскальнік*

# ФАРМІРАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ІХ САМАСТОЙНАЙ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вышэйшая адукацыя ў новым тысячагоддзі становіцца працэсам самапазнання, самааднаўлення, самаўдасканалення, што немагчыма без самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Інфармацыйнае грамадства XXI стагоддзя патрабуе не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў у розных галінах яго развіцця. Грамадству патрэбна асоба, якая валодала б інфармацыйнай культурай.

Упершыню праблема інфармацыйнай культуры была пастаўлена расійскім навукоўцам А.П.Суханавым у канцы 80-х гадоў XX стагоддзя.

Культура ў грамадстве фарміруецца шляхам суміравання вопыту шматлікіх пакаленняў у выніку матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці ўсіх класаў, груп і асоб, якія складаюць грамадства. Інфармацыйная культура ў такім кантэксце, на думку А.П.Суханава, уяўляе дваякі працэс: з аднаго боку — гэта

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выкарыстанне набытай інфармацыі, з другога — яе стварэнне і замацаванне на рознага роду матэрыяльных носьбітах.

У 1993 г. у Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі быў створаны аддзел інфармацыйнай культуры, які аб'яднаў вучоных розных галін ведаў вышэйшых навучальных установ і навуковых установ Расіі, блізкага і далёкага замежжа. Штогод сталі праводзіцца міжнародныя канферэнцыі, публікавацца зборнікі тэзісаў дакладаў і артыкулы па фундаментальных пытаннях інфармацыйнай культуры асобы. Удзел у іх прымаюць і нашы беларускія вучоныя, у прыватнасці доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Р.С.Матульскі.

У публікацыях разглядаюцца гуманітарныя аспекты інфармацыйнай культуры — дзейнасць чалавека па атрыманні, апрацоўцы, захаванні і перадачы інфармацыі; праблемы павышэння інфармацыйнай культуры грамадскасці і яе прававое рэгуляванне; фарміраванне інфармацыйнай культуры ў розных плоскасцях: сацыяльнай, псіхалагічнай, маральна-этычнай, светаўспрыманні.

Найбольшая ўвага надаецца тэхналагічнай функцыі інфармацыйнай культуры: авалоданню інфармацыйнымі тэхналогіямі, знаёмству з інфармацыйнымі рэсурсамі грамадства, навыкамі пошуку патрэбнай інфармацыі, яе захаванню і выкарыстанню.

Вызначэнне тэрміна "інфармацыйная культура" падаецца навукоўцамі ў кантэксце з функцыянальным, узроўневым, змястоўным, карацей кажучы, рэлевантным даследаваннем праблемы.

Змястоўны ўклад у праблему ўнес В.Е.Лявончыкаў, які сфармуляваў інфармацыйныя патрэбы асобы, вызначыў шляхі пошуку метадалогіі, разгледзеў рэгіянальны аспект, вылучыў культуралагічныя праблемы ў распрацаваным ім вучэбным курсе "Інфармацыйная культура асобы".

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Беларускі вучоны, прафесар А.С.Зубра выказаў свой погляд на фарміраванне ўвогуле культуры асобы студэнта. Згодна яго меркаванням культура асобы ўключае візуальную, сацыяльную, духоўную, псіхалагічную культуру і культуру цела. На наш погляд, інфармацыйная культура асобы з'яўляецца квінтэсенцыяй усіх гэтых частак.

Менавіта інфармацыйная культура фарміруе статус асобы, каштоўнасныя арыентацыі, матывы, функцыянальныя ролі, гэта значыць сацыяльную культуру.

Інфармацыйная культура садзейнічае развіццю і ўдасканаленню інтэлектуальнай, эстэтычнай, маральнай, валявой культуры, культуры светапогляду і пачуццяў — увогуле духоўнай культуры.

Ад інфармацыйнай культуры ў значнай ступені залежаць і псіхічныя працэсы, стан, уласцівасці, сензітыўнасць, эмпатыя, рэфлексія (псіхілагічная культура).

Інфармацыяная культура асобы спрыяе набыццю высокай візуальнай культуры (культуры аблічча, адзення, мовы, эмоцый, разумовай працы). Культура цела (чысціня, акуратнасць, здароўе, фізічная культура) таксама фарміруецца пад уплывам інфармацыйнай культуры.

Такім чынам, інфармацыйная культура аб'ядноўвае і забяспечвае працэс і культуры дзейнасці, і культуры свядомасці студэнта.

Як, якім чынам можна і патрэбна арганізаваць самастойную пазнавальную работу студэнтаў, якая б спрыяла фарміраванню інфармацыйнай культуры?

Перш за ўсё змест адукацыі павінен быць цалкам скіраваны на здзяйсненне філасофскай "Я—канцэпцыі". У кантэксце "Я—канцэпцыі" нам асабліва імпануюць тэорыя Э.В.Ільянкова ("асобай не нараджаюцца, а становяцца ў працэсе свядомай дзейнасці") і даследаванні беларускага вучонага М.Г.Яленскага аб сучасных асобасна арыентаванных адукацыйных парадыгмах.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У адпаведнасці з думкамі гэтых вучоных асобу навучэнца можна разглядаць праз прызму такіх каштоўнасцей, як высокая вучэбная паспяховасць, карысная для грамадства сацыяльная актыўнасць, творчая дзейнасць, індывідуальнасць, свабода.

Вядома, што набыць гэтыя каштоўнасці магчыма толькі праз сістэматычную пазнавальную дзейнасць у працэсе самапазнання, самаўдасканалення, самаразвіцця. Але для гэтага змест адукацыі ў вышэйшай навучальнай установе павінен садзейнічаць арганізацыі такога педагагічнага ўздзеяння, якое б спрыяла развіццю індывіда, інакш кажучы, ператварыла студэнта з аб'екта адукацыі ў суб'ект, са спажыўца інфармацыі ў творцу ведаў.

Прафесія бібліятэкара — унікальная. Як вядома, бібліятэчны спецыяліст, з аднаго боку, з'яўляецца аб'ектам інфармацыйнага ўздзеяння, як і кожная асоба; яму неабходна інфармацыя. З другога — ён выступае як суб'ект актыўнай інфармацыйнай дзейнасці, які ўдзельнічае ў развіцці і ўдасканаленні інфармацыйнай культуры грамадства і асобы.

Самастойная работа студэнта факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм у межах розных вучэбных дысцыплін і ў розных формах пэўным чынам садзейнічае ўмацаванню і развіццю гэтых узаемазвязаных бакоў прафесіі. Каб зрабіць працэс больш эфектыўным, неабходна асаблівую ўвагу надаць актыўным відам індывідуальнай работы, інакш кажучы, не даць студэнту тое, да чаго ён павінен прыйсці сам. Цыкл спецдысцыплін павінен быць накіраваны не толькі на памнажэнне ведаў, навыкаў пэўнай дзейнасці, але і на развіццё прафесійнага мыслення, агульнай метадалогіі творчай дзейнасці.

Лекцыі і семінары нельга разглядаць як галоўны сродак перадачы інфармацыі. Іх мэты:

— выклікаць зацікаўленасць да вучэбнай дысцыпліны (інфармацыяй аб апошніх навуковых даследаваннях, пастаноўкай вострых праблем і інш.);

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— вызначыць месца пэўнай навукі ў сумежных галінах;

— пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі прынцыпамі вывучэння курса;

— даць устаноўку на самастойную работу (знайсці пабуджальныя матывы).

У такім выпадку паўстае пытанне аб змяненні мадэлі вучэбнага працэсу ў бок акцэнту на самастойную работу студэнта, метадычную дзейнасць выкладчыка, супрацоўніцтва са студэнтам падчас кансультацый, на змяншэнне аўдыторных заняткаў і пераходу да пазааўдыторных як асноўнай формы навучальнага працэсу. Тады навучэнец набывае навыкі і ўменні самастойна вучыцца.

Мяркуецца, што пры такой мадэлі студэнт здолее хутчэй навучыцца адрозніваць каштоўнасці спажывецкага, рэпрадуктыўнага і стваральнага кірункаў інфармацыйнай дзейнасці. Ён вопытным шляхам знойдзе доказ таго, што менавіта рэпрадуктыўная і стваральная накіраванасць характарызуе высокі ўзровень інфармацыйнай дзейнасці асобы, фарміруе каштоўнасныя арыентацыі як важнейшы кампанент інфармацыйнай культуры. Пры гэтым выкладчыкі змогуць назіраць узрастанне здольнасці ў студэнта да ацэнкі інфармацыі ў выніку яе самастойнага пошуку.

Абапіраючыся на навуковыя даследаванні, якія праводзіліся напрыканцы 90-х гадоў XX стагоддзя ў псіхалогіі і педагогіцы вышэйшай школы (А.М.Андрыянчык, Б.У.Бокуць, А.В.Вярбіцкі, І.І.Кабыляцкі, А.П.Сманцар, І.Э.Унт і інш.), і на педагагічную практыку, мы прыйшлі да высновы, што самастойную пазнавальную дзейнасць студэнта найбольш стымулюе размеркаванне вучэбнага матэрыялу на асобныя ўзаемазвязаныя элементы, кожны з якіх забяспечваецца неабходнымі метадычнымі матэрыяламі. Пры гэтым выкладчык ставіць пэўную задачу і распрацоўвае методыку яе рашэння.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Пры выкладанні курса “Бібліятэка і вольны час” паспяхова вырашаюцца наступныя задачы:

— вызначэнне элементаў зацікаўленасці, унутранай падрыхтаванасці да асваення курса (уваходны кантроль метадам анкетавання);

— вызначэнне асабістых інтарэсаў студэнта (самастойны выбар розных варыянтаў вучэбных заданняў, прапанаваных праграмай курса);

— вызначэнне накірункаў самастойнай пазнавальнай дзейнасці (з дапамогай пакета метадычных матэрыялаў, што ўключаюць методыку самастойнага пошуку інфармацыі, методыку распрацоўкі выбраных студэнтам вучэбных заданняў, пералік бібліятэчных сродкаў і інфармацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць паспяховае выкананне задання);

— вызначэнне працэсу самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнта (з дапамогай розных відаў аўдыторнай і пазааўдыторнай работы). Пазааўдыторная работа складаецца з дзвюх частак: абавязковай і дадатковай. Абавязковая ўключае заданні па пошуку, напрыклад да вечарыны, літаратурнага матэрыялу, аўдыёматэрыялу, відэаматэрыялу, працу са слоўнікамі, падрыхтоўку да аўдыторных самастойных заданняў, індывідуальныя дамашнія заданні, выкананне курсавых работ, падрыхтоўку фрагмента мерапрыемства і інш.

Дадатковая пазааўдыторная работа вядзецца па спецыяльным плане ў залежнасці ад індывідуальных схільнасцей, інтарэсаў, творчых здольнасцей студэнтаў. Яна ўключае:

— выкананне дамашніх заданняў творчага характару (складанне вершаў, мастацкае вырашэнне афармлення выставы, мантаж літаратурнага матэрыялу і інш.);

— навукова-даследчую работу (напрыклад, аналіз навуковых крыніц і практычнага матэрыялу па ўдзеле бібліятэкі ў экалагічнай асвеце, адукацыі і выхаванні моладзі);

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— вывучэнне дадатковых навуковых, навукова-папулярных, вучэбных дакументаў;

— падрыхтоўку да навуковых студэнцкіх канферэнцый, чытанняў, сімпозіумаў і інш.

Мэтай методыкі з'яўляюцца вызначэнне вынікаў самастойнай работы студэнтаў, заключны кантроль у форме рэфератаў, дакладаў, судакладаў, паказальных мерапрыемстваў, семінараў, круглых сталоў, удзелу ў навукова-метадычных студэнцкіх канферэнцыях.

Самы высокі ўзровень самастойнай работы студэнтаў характарызуецца творчасцю, якая звязана з пошукам новых рашэнняў, новых прынцыпаў у распрацоўцы праблемы.

Эфектыўнасць гэтай працы, якая арганічна садзейнічае фарміраванню інфармацыйнай культуры студэнта, залежыць ад дакладнай яе арганізацыі, рацыянальнага планавання, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ